Дидло. Его имя навсегда ассоциируется с русским балетом, войдя в историю русской культуры.

СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ:

1. Вклад И. И. Вальберха и Ш. Л. Дидло в развитие русской балетной школы [Электронный ресурс] // Происхождение и виды хореографического искусства. – Режим доступа: http://www.psihdocs.ru/proishojdenie-i-vidi-horeograficheskogo-iskusstva.html?page=18-. – Дата доступа: 02.03.2020.

2. Королева, Н. В. Дидло венчался славой... [Электронный ресурс] / Н. В. Королева. – Режим доступа: http://a-s-pushkin.ru/books/item/f00/s00/z0000021/st025.shtml. – Дата доступа: 02.03.2020.

3. Трускиновская, Д. М. 100 великих мастеров балета. / Д. М. Трускиновская. – М. : Вече, 2016. – 320 с.

4. Шарль-Луи Дидло [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.belcanto.ru/didelot.html. – Дата доступа: 02.03.2020.

5. Шарль Луи Дидло – основатель современной методики классического танца [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://gymnasium441.ru/files/predmet/informatika/sites/Stogova_12/index5.html- Дата доступа: 02.03.2020.

6. Школа классического танца [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://studme.org/315894/kulturologiya/shkola_klassicheskogo_tantsa. – Дата доступа: 02.03.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хомутова И. В., БГУКИ, студент 403 группы
очной формы обучения
Научные руководители – Дорошевич Э. К.,
доктор философских наук, профессор;
Калацей В. В., кандидат культурологии. доцент

# УПЛЫЎ ТРАДЫЦЫЙНАГА СВЕТАПОГЛЯДУ НА ФАРМІРАВАННЕ ЭСТЭТЫЧНАЙ ДУМКІ ПАЛЕШУКОЎ

Чалавек заўсёды выхоўваецца ў пэўным прыродным і культурным асяроддзі. І для яго жыцця асяроддзе, створанае культурай продкаў і ім самім, не меньш важнае, чым прырода [9, с. 195].

Разам са сваёй групай (кіраўнік курса – дацэнт кафедры этналогіі і фальклору Наталля Петухова) я неаднойчы наведвала з культурна-антрапалагічнымі экспедыцыямі Палессе. Запісаны ў Маларыцкім раёне Брэсцкай вобласці матэрыял (Калядны абрад і бытавая сцэнка “Іванавы ягады”) стаўся асновай нашых дыпломных праектаў. Назіраючы за тым, як думкі, мысленне, выказванні носьбітаў традыцыйнай культуры Палесся стасуюцца з эстэтыкай іх мастацтва – манерай спеваў, асаблівасцямі этнаграфічнага касцюму, харэапластыкай побытавых танцаў я зразумела, што паміж светапоглядам і мастацтвам творцы існуе непарыўная повязь. І ў палешукоў гэтая повязь, цэласнасць асобы творцы мастацтва захавалася як нідзе. Адзін з найбольш яскравы прыклад – Кацярына Панчэня – лідар суполкі выканаўцаў веснавога абраду «Юраўскі карагод» вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці, абраду, які ў мінулым 2019 годзе ўключаны ў найпрэсціжны «Спіс сусветнай культурнай спадчыны», які складае Бюро ЮНЕСКА ў Парыжы.

Уся гісторыя эстэтычнай думкі ўяўляе з сябе гісторыю рэалізацыі бесперапыннага працэсу спасціжэння суб‘ектыўнай ісціны ў галіне эстэтычнага засваення рэчаіснасці, наогул, і мастацкага пазнання, ў прыватнасці. Тыя ці іншыя тэорыі, якія разглядаюцца ў гісторыі эстэтычных вучэнняў, уяўляюць сабой прытулкі на шляху да гэтай аб‘ектыўнай праўды, адлюстроўваюць навуковыя заканамернасці, якія валодаюць характарам усеагульнасці. Гэта паўсюджанасць абмежавана месцам і часам, узроўнем грамацкай практыкі. Узнікненне ў канкрэтны перыяд гісторыі народа той ці іншай эстэтычнай тэорыі, барацьба ў поглядах на асноўныя эстэтычныя праблемы, вядучая да змены адных канцэпцый і цэлых сістэм іншымі, – усе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтыя працэсы, як справядліва падкрэслівае расійскі эстэтык і філосаф Міхаіл Аўсяннікаў, у канчатковым рахунку абумоўлены зменамі ў рэальных умовах жыцця народа [8, с. 10]. А пакольві гістарычнае развіццё народаў, узровень прагрэсу ў развіцці вытворчых сіл культуры ў мінулым былі ў вышэйшай ступені разнастайнымі, пастолькі і дасягнуты ў пэўны перыяд ўзровень развіцця мастацтва і эстэтычнай думкі ў розных народаў быў далёка не аднолькавым. Нават у розных рэгіёнах адной краіны можа адрозніваецца. Гісторыку эстэтыкі даводзіцца мець справу не толькі з тэорыямі, абагульняючымі вопыт сусветнага мастацтва, і таму якія маюць універсальны характар, але і з тэорыямі іншага кшталту, абагульняючымі, галоўным чынам, вопыт нацыянальнага мастацтва, які сведчыць аб далучэнні народаў, асобных рэгіянальных супольнасцей да сацыяльнага прагрэса і эвалюцыі сусветнага мастацтва [5, с.6], у якое народы і іх лакальныя супольнасці робяць свой унёсак.

Безумоўна, адной з найвядомых асаблівасцей крыніц гісторыі беларускай эстэтыкі з‘яўляецца яе полілінгвістычны характар. Пачыная з X стагоддзя, часткі тэрыторыі сучаснай Беларусі ўваходзілі ў склад Кіеўскай Русі, потым – Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, затым – Рэчы Паспалітай і (з канца XVIII да пачатку XX стагоддзя) – у склад Расійскай імперыі [5, с. 7]. На пачатку XX стагоддзя, нягледзячы на складаныя ўмовы, фарміруецца дэмакратычны напрамак краёвай ідэалогіі альбо дэмакратычны варыянт ідэалогіі нацыі ―дзяржаўнага” тыпу [4, с. 254]. Каля 100 гадоў таму, 9 сакавіка 1918 г. была створана Беларуская Народная Рэспубліка, нажаль, праіснаваўшая не доўгі час. Але за гэты кавалак часу паспела выйсці Устаўная Грамата Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, 25 сакавіка 1918 г. (дадатак 1). У 1921 годзе Заходняя Беларусь адышла да Польшчы паводле Рыжскага мірнага дагавора паміж Польшчай, з аднаго боку, і Расіяй і Украінай, з другога. Сучасныя Брэсцкая, Гродзенская, часткі Мінскай і Віцебскай абласцей знаходзіліся ў складзе Польшчы да 17 верасня 1939 года, а потым землі ўвайшлі ў склад БССР, дзе праводзіўся курс

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

саветызацыі Беларусі, індустрыялізацыя і калектывізацыя [13, с. 201]. 27 ліпеня 1990 года Беларусь канчаткова абвясціла сваю незалежнасць: Вярхоўным Саветам была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР. 25 жніўня 1991 года Дэкларацыі быў нададзены канстытуцыйны статус. 19 верасня 1991 года краіна атрымала новую назву – Рэспубліка Беларусь [7, с. 437].

Безумоўна, гэтыя гістарычныя падзеі наклалі свой адбітак на фарміраванне народнай культуры, этыкі і філасоўскай думкі беларусаў, у тым ліку і беларусаў-палешукоў. Вяртаючыся да полілінгвістычнага характара беларускай эстэтыкі, хачу звярнуць увагу на дыялектныя асаблівасці заходнепалескіх гаворак на прыкладзе даследаванай маім курсам у экспедыцыях вёскі Хаціслаў. Паўночна-заходняя дыялектная зона беларускай мовы сфарміравалася ў працэсе славяна-балцкага этнамоўнага ўзаемадзеяння, якое ў дадзеным рэгіёне мае больш за тысячагадовую гісторыю [1, с. 5]. Шэраг дыялектолагаў разглядае заходнепалескія гаворкі Беларусі як пераходныя ад беларускай да ўкраінскай мовы (на падставе вялікай колькасці фанетычных і граматычных асаблівасцей, падобных з рысамі паўночнаўкраінскіх гаворак) [10, с. 298]. Перыяд білінгвізму абавязкова ўзнікае і тады, калі ўзаемадзеянне моў суправаджаецца асіміляцыяй і, у далейшым, субстратызацыяй адной з іх. У адносінах да паўночна-заходняй дыялектнай зоны апошняе надзвычай актуальна [2, с. 15].

Разгледзім узоры народнай эстэтыкі на прыкладзе Каляд вёскі Хаціслаў. Па-першае, мы ўжо адзначылі самаідэнтыфікуючыя палешукоў дыялектныя асаблівасці, па-другое, вельмі яскрава бачна павага да прыватнага жыцця асобы праз звароты калядоўшчыкаў да гаспадара. Калі раптам не застаюць гаспадароў дома, кажуць, што яны заняты важнымі справамі, што іх вызваляе ад візіта каляднай грамады.

У песнях каляднага абыхода бачна сувязь язычніцкай і хрысціянскай традыцыі. Даследчыкі лічаць, што напісаная да рэлігійных святаў паэзія вобразна-тэматычна суадносіцца з фальклорнай каляндарна-абрадавай. Тут

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звычайна апісваецца, якой падзеі свята прысвечана, навакольная прырода ў гэту пару года і асабістае ўспрыманне свята (суправаждаючыя яго акалічнасці жыцця і эмоцыі). Да такой разнавіднасці як раз такі адносяцца “Каляды” [11, с. 39]. Так, напрыклад, песня “Добры вечор тобі” адносіцца да больш позняй хрысціянскай традыцыі, а “На горі вовчок” мае язычніцкія карані. Вельмі цікавым прыкладам узаемасувязі дзвух традыцый з‘яўляецца песня “А ў нашога хозяіна”, у якой напеў хрысціянскі, а словы народныя.

Найважнейшым складальнікам любой нацыянальнай культуры з‘яўляецца філасофія. На Беларусі яна мае глыбокія карані і на працягу ўсёй шматстагоддзявай гісторыі краіны выступае ў якасці фундаментальнай інтэгратыўнай асновы беларускай культуры цалкам. Важным фактарам узнікнення філасофіі на Беларусі стала прыняцце на прыканцы X ст. хрысціянства Кіеўскай дзяржавай [12, с. 5] і суседнімі княствамі.

Разгледзім “народную філасофію”. Адной з гістарычных перадумоў узнікнення філасофіі з‘яўляецца раз‘яднанне фізічнай працы ад разумовай. З пачатку зараджэння філасофія спрабавала растлумачыць сусвет натуральнымі прычынамі. Па гэтай прычыне з‘явілася міфалогія і вера ў звышнатуральную сілу. Напрыклад, міф аб Боге Гразы пры наяўнасці шэрага шырокіх тыпалагічных паралелей у розных народаў света можна лічыць агульным ўспадкоўваннем старажытных індаеўрапейскіх традыцый [6, с. 4]. На Заходнім Палессі гэта знайшло адлюстраванне ў комплексах сямейна-абрадавых і календарна-абрадавых святах. Можна прыняць меркаванне этнографа Адама Багдановіча, што Каляды належаць да ліку святкаванняў сонечнага культу. У Калядах вёскі Хаціслаў бачым, як народ звяртаецца да тэмы «памірання і нараджэння» года, а таксама сонца – як гадавога сімвалу – праз калядную “казу” і абыходную традыцыю. Акрамя астральна скіраваных для славянскай міфалогіі характэрны шэраг іншых міфапаэтычных постацяў. Так узімку бачна звяртанне да нейкага міфалагічнага персанажа – Каляды. Гэта знайшло адлюстраванне ў тэкстах рэфрэнаў песень [3, с. 220], у тым ліку – песень вёскі Хацiслаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, відавочна, што на фарміраванне эстэтычнай думкі палешукоў, знаходзячай адлюстраванне ў іх дагэтуль жывым мастацтве вуснай традыцыі, паўплывалі асаблівасці традыцыйнага светаўспрымання народа, няпростая поліэтнічная гісторыя края, філасофскія, рэлігійныя ідэі яго жыхароў, а таксама іх моўна-лінгвістычныя асаблівасці.

СПІС ВЫКАРАСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Астрэйка, В. Роль балтийского языкового элемента в формировании номинационной системы говоров северо-западной диалектной зоны белорусского языка // Исследования по славянской диалектологии. – М., 2006. – Вып. 12.

2. Беларуская лінгвістыка / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы; рэдкал.: А. А. Лукашанец (гал. рэд.) і [інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – Вып. 65. – 165 с.

3. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мінск : Беларусь, 2004. – 592с.

4. Гісторыя Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у дакументах і матэрыялах : хрэстаматыя / уклад., навуковы рэдактар А.Ф. Смалянчук. – Вільня : ЕГУ, 2007. – 302 с.

5. Дорошевич, Э. К. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии / Э. К. Дорошевич, Вл. Конон. – М. : Искусство, Москва, 1972.

6. Иванов, В. В. Исследования в облости славянских древностей / В. В. Иванов, В. Н. Топоров. – М. : Наука, 1974.

7. Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі: Са старажытнасці і да нашых дзён / Г. П. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 2002. – 464 с.

8. Овсяников, М. Ф. Очерки истории эстетических учений / М. Ф .Овсяников, З. В. Смирнова. – М., 1963.

9. Петухова, Н. В. Экалогія традыцыйнай культуры і народных спеваў / Н. В. Петухова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі): зб. навук. прац / М-ва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры Рэсп. Беларусь, Беларускі дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; рэдкал.: Языковіч В. Р. (старш.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2017. – 212 с.

10. Судник, М. Р. Белорусский язык // Лингвистический энциклопедический словарь / Гл. ред. В. Н. Ярцева. – М: Советская энциклопедия, 1990. – 685 с.

11. Фальклoctстыка і славістыка : зб. навук. прац па матэрыялах VI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі ―Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў" (Мінск, Беларусь, 19-20 лістапада 2015 года) / гал. рэд. А. І. Лакотка; Цэнтр даследванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2016. – 176 с.

12. Философская мысль Беларуси : учеб. пособие / А. А. Козел. – Мінск : Амалфея, 2004. – 352 с.

13. Шымуковіч, С. Ф. Гісторыя Беларусі: курс лекцый / С. Ф. Шымуковіч – Мінск, 2005. – 235 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хороших Е. Г., БГУКИ, студент 430м группы
очной формы обучения
Научный руководитель – Козленко Е. Ю.,
кандидат педагогических наук, доцент

## СОЦИАЛЬНЫЕ СЕТЕВЫЕ СЕРВИСЫ В ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ КОММУНИКАЦИИ БИБЛИОТЕЧНЫХ СПЕЦИАЛИСТОВ

Стремительное развитие цифровых технологий и глобальной сети Интернет влияют на профессиональное библиотечное общение. Явными преимуществами профессиональных электронных контактов являются их оперативность и экономичность. Онлайновые технологии дают возможность максимально эффективно и оперативно распространять информацию, при этом частично заменяя (или видоизменяя) традиционные формы